# ДУХОЎНА-МАРАЛЬНЫЯ АСНОВЫ АДУКАЦЫІ: ТРАДЫЦЫІ І ІНАВАЦЫІ

Казак Л.І.,
Дырэктар Дзяржаўнай установы адукацыі “Ельская раённая гімназія”, г.Ельск

> У аснове многіх праблем
> сучаснага грамадства ляжыць
> найглыбешы крызіс асобы.
> Прычына яго – страта духоўнасці.

Як нікому, настаўнікам бачны гэтыя праблемы выхавання. Яны з вучнямі штодзень. І як ніхто, мы, педагогі, разумеем: каб не дапусціць дэградацыі, трэба накіраваць грамадскую свядомасць на шкалу духоўных, маральных каштоўнасцей. Чым вышэй маральнасць у народзе, тым мацней і сама дзяржава. Паглядзім на гісторыю: як толькі падала маральнасць – у краіны ўзнікалі праблемы і нават цэлыя народы знікалі пры падзенні маральнасці.

Абмяркоўваючы важнейшыя пытанні адукацыі, задачы ўзаемадзеяння Царквы і дзяржавы на дваццатых міжнародных Калядных адукацыйных чытаннях Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсея Русі Кірыл абазначыў праблемы усёй сістэмы адукацыі, з якімі сёння сустракаюцца не толькі краіны гістарычнай Русі, але і большасць дзяржаў свету. Па словах Свяцейшага, ва ўмовах, калі хутка растуць тэхнічныя магчымасці і павялічваецца аб'ём атрымліваемай інфармацыі, юнацтва аказваецца перад вялікай небяспекай: з магутнага інфармацыйнага патоку цяжка вызначыць неабходнае для інтэлектуальнага, духоўнага, культурнага развіцця.

Усё большую папулярнасць атрымлівае перакананне, што для юнага чалавека авалодванне тэхналогіямі важней сістэмнага, глыбіннага вывучэння навукі і культуры. Выхаваўчая функцыя пры гэтым часта становіцца скарочанай.

Даступнасць інтэрнэту і розных электронных баз стварае ілюзію інфармацыйнай усеўлады, магчымасць адказаць на любое пытанне нажаццем кнопкі, а таму сучасныя юнакі і дзяўчаты не лічаць неабходным запамінаць. І мы ўжо сутыкаемся з праблемай кароткачасовай памяці, праблемай замбіравання.

Асаблівыя адносіны павінны быць да навук, на аснове якіх фарміруецца асоба чалавека, развіваецца цывілізацыя.

У педагогіцы асэнсоўваецца важнасць духоўна-маральнага выхавання, выніковасць якога немагчыма без прыцягнення культурастваральнай спадчыны праваслаўя.

З першага года працы (а гімназія працуе з 2009) мы бачым свой абавязак у выхаванні грамадзяніна, патрыёта, чалавека, які будзе валодаць каштоўнаснымі арыентацыямі, што заснаваны на хрысціянскай маральнасці і нацыянальных прыярытэтах.

У трох працуючых спыталі, што яны робяць:

- Цягаю каменне, - адказаў адзін.

- Зарабляю грошы, - дадаў другі.
- Будую Храм, - паясніў трэці.

Як пабудаваць гэты велічны Храм дзіцячай душы, каб ён мог супрацьстаяць спакусам, цяжкасцям, няшчасцям? Памятаеце? "… И пошёл дождь, и разлились реки, и подули ветры, и устремились на дом тот, и он не упал, потому, что основан был на камне."

Такім надзейным падмуркам для душы і ёсць правільна сфарміраваная маральная пазіцыя.

Як узнаўляецца дыфіцыт маральнасці, запаўняецца духоўная пустэча? Праз Слова… "А напачатку было Слова. І Слова было ў Бога. І Богам было Слова…" Праз літаратуру, выхаваўчы аспект урока, мерапрыемствы… З дня ў дзень, сістэмна, традыцыйна. Праз пазіцыю настаўніка, прафесійным крэдам якога з'яўляецца тое, што чалавек кіруецца ў жыцці трыма ісцінамі: верай, надзеяй, любоўю. Любоўю найбольш. Любоў доўга церпіць, любоў міласэрнічае, любоў не зайздросціць… Любоў ніколі не перастае быць.

Адзін у полі ніколі не воін. У выхаванні проста неабходна быць усім светам, усім грамадствам.

Ужо на другі год сваёй працы, скарыстаўшы магчымасць пагаднення дзяржавы з Беларускай праваслаўнай царквой (2003г.), праграмы супрацоўніцтва Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквы, мы арганізавалі ўрокі духоўнасці. Іх рэгулярна праводзіць настаяцель Храма Святой Жываначальнай Троіцы протаіерэй Георгій. Тэмы сустрэч самыя featured рознабаковыя: "Біблейскія запаветы", "Аснова выхавання", "Мяне хвалюе…", "Умей любіць і даравць", "Дабро і зло: адвечная барацьба", "Не адступіся"… Дарэчы, гэта работа з вучнямі арганізавана толькі па заявах бацькоў і на дабравольнай аснове.

Настаяцель Храма заўсёды жаданы госць гімназіі. Бацькоўскія сходы, выпускныя вечары, пасяджэнне бацькоўскага клуба, лінейкі…

Ужо традыцыйным мерапрыемствам (з 2011) для нашай гімназіі стала арганізацыя і правядзенне раённых духоўна-маральных Свята-Іаанаўскіх чытанняў "Вечныя каштоўнасці". З 2014 года ім нададзены статус міжраённых, а цяпер – мижрэгиянальных. Мэта чытанняў – развіццё духоўна-маральных, патрыятычных якасцей вучняў праз далучэнне да духоўна-культурнай спадчыны і нацыянальнай культуры. У рамках чытанняў арганізавана работа секцый даследчых, творчых работ, аратарскага майстэрства, тэматычных відэаролікаў, правядзенне інтэлектуальнай конкурснай гульні "Беларусь гістарычная. Беларусь праваслаўная". Для бацькоў, педагогаў, вучнёўскага актыву, гасцей, прадстаўнікоў Тураўскай епархіі, аддзела адукацыі, спорту і турызму –

“круглы стол”-дыялог. Па выніках чытанняў сфарміравана і папаўняецца медыятэка, выпускаецца газета “Гімназічны веснік”.

Педагагічны сэнс работы па духоўна-маральным выхаванні асобы вучня заключаецца ў тым, каб дапамагаць яму рухацца ад элементарных навыкаў паводзін да больш высокага узроўню. З гэтай мэтай узнікла ідэя правядзення дабрачынных акцый “Добрае сэрца”, “Твары дабро”. Матэрыяльная дапамога пацыентам дзіцячай бальніцы ў Бараўлянах, дабрачынная дапамога з канцэртнай праграмай пацыентам бальніцы сястрынскага догляду вёсак Зашыр’е, Скароднае Ельскага раёна, дапамога састарэлым грамадзянам… - традыцыйныя справы дзяцей, бацькоў, педагогаў гімназіі. У свет трэба ісці з дабром.

З 2013 года ў нашай установе адукацыі праводзіцца цыкл мерапрыемстваў пад агульнай назвай “Калядныя сустрэчы”. Гэта дыялог-сустрэча “Мы разам”, дзе ў якасці субяседнікаў – бацькі, дзеці, цікавыя госці, абавязкова настаяцель Храма, прадстаўнікі аддзела адукацыі, спорта і турызму, прадстаўнікі прыёмных сямей, шматдзетных, праблемных. Гэта абавязковае правядзенне акцыі “Нашы сэрцы – Вам”, тэматычныя выставы – экскурсіі…

Не варта забываць, што асяродкам выхавання з’яўляецца сям’я. Першая жыццёвая школа, дзе настаўнікамі з’яўляюцца бацькі і родзічы, а ўрокамі – іх паводзіны. Памятаючы, што нацыя, у якой інстытут сям’і разрушаны, не мае будучыні, мы імкнемся да ўмацавання традыцыйных сямейных каштоўнасцей. На ўсіх мерапрыемствах, ва ўсіх справах разам з намі нашы паплечнікі – бацькі.

Асобае месца ў рэалізацыі духоўна-маральнага выхавання займае краязнаўчы матэрыял. Сустрэчы, паездкі, экскурсіі… Мазыршчына, Нараўляншчына, Тураўшчына, Жыровічы, г.Полацк, г.Мінск, г.Гомель. І свая родная Ельшчына.

Багатая наша Беларусь на людзей, памятныя месцы.А Ельская зямля мае сваю святыню. Гэта помнік архітэктуры 17 стагоддзя – Храм Святой Жыванachальнай Троіцы і цудадзейны абраз Васькаўскай іконы Божай Маці. Не адзін раз яны станавіліся аб’ектам даследчай дзейнасці нашых вучняў. Не адзін раз мы прымалі гасцей, праводзячы экскурсіі па нашым горадзе, з гонарам расказваючы пра святыні.

Мы памятаем, што выхаваўчая работа не павінна заключацца ў адзінкавых маштабных мерапрыемствах. Важна сістэмнасць. Таму на працягу года арганізуюцца і праводзяцца тэматычныя тыдні. Тыдзень Маці, Тыдзень Добрых Спраў, Тыдзень сям’і…

Вучні і педагогі гімназіі заўсёды удзельнічаюць у конкурсах, чытаннях, канферэнцыях, што праходзяць ва ўстановах адукацыі вобласці пры падтрымцы Тураўскай, Гомельскай епархій.

Штогод у нас ёсць удзельнікі і пераможцы ў міжнародным конкурсе творчых работ, які праводзіць Інстытут тэалогіі імя святых Кірыла і Мяфодзія БДУ.

У выхаванні, як і ў навучанні, на якасны вынік павінны працаваць усе сродкі. Быць маральным – даступна для ўсіх. Галоўнае, каб разумелі вучні і іх бацькі, што гэта і ёсць падмурак нацыянальнай моцы і духоўнай сталасці. Каб у дзіцячых душах узрасло пасеянае “разумнае, добрае, вечнае”, а ў свядомасці замацавалася, што чалавек павінен наперад глядзець з надзеяй, назад – з удзячнасцю, уверх – з верай, а па баках – з любоўю.